View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

*УДК 947.6:329«19»*

***У.С. Пуцік,*** *кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан факультэта перападрыхтоўкі спецыялістаў адукацыі ІПК і ПК БДПУ*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ ПЫТАННЕ Ў ПРАГРАМАХ І ДЗЕЙНАСЦІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (НА МЯЖЫ XIX–XX ст.)

Важнейшыя перадумовы ўздыму нацыя-нальных рухаў у Еўропе XIX ст. – мабілізацыя грамадства ў выніку распаду саслоўна-феадальнай сістэмы, вызваленне сялян, індустрыялізацыя і урбанізацыя, распаўсюджанне пісьменнасці, развіццё школьнай адукацыі і друку. Абвастрэню нацыянальнага пытання садзейнічала паглыбленне дэмакратычных працэсаў і прынцыпаў парламентарызму, пашырэнне правоў чалавека як у палітычнай, так і сацыяльна-эканамічнай сферах. У гэтых умовах натуральным з'явілася фарміраванне ідэі аб правах людзей на захаванне сваёй самабытнай этнічнай еднасці і культуры ў тым ліку і на падставе ўтварэння ўласнай дзяржаўнасці.

Працэс развіцця большасці еўрапейскіх нацыянальных рухаў чэшскі гісторык Міраслаў Хрох падзяліў на тры фазы. У першай з іх – фазе прабуджэння (А) – узнікае цікавасць параўнальна невялікай групы адукаваных людзей да мовы, гісторыі і фальклору пэўнай этнічнай групы. У фазе агітацыі (В) нацыянальная свядомасць распаўсюджваецца ў шырокіх праслойках, адбываецца іх мабілізацыя і інтэграцыя ў нацыянальнае згуртаванне. Калі гэта дасягнута, то ў фазе масавага руху (С) большая частка грамадства ахоплена ідэямі нацыянальнай свядомасці і мабілізуецца на барацьбу спачатку за аўтаномію, а потым за незалежнасць [1, с. 125].

Праблема гэта тычылася ў першую чаргу шматнацыянальных дзяржаў, якімі у той час былі Расійская, Аўстрыйская і Асманская імперыі. Істотную ролю ў прыданні палітычнай вастрыні нацыянальнаму пытанню сыгралі сацыялістычныя партыі, паколькі сярод іх было асабліва шмат нацыянальных арганізацый. Імі рапрацоўваліся падыходы, якія аб'ядноўвалі класавыя і нацыянальныя прынцыпы.

Значную актыўнасць у распрацоўцы першых праграм па нацыянальным пытанні выявілі лідэры аўстрыйскіх сацыял-дэмакратаў. Галоўная ідэя іх праграмных патрабаванняў па дадзеным пытанні зводзілася да дазволу кожнаму народу права на культурна-нацыянальную аўтаномію. Былі ў сацыял-дэмакратычным асяродку і прыхільнікі прынцыпу, што выражаўся ў лозунгу: «Адна нацыя – адна дзяржава». Аднак ён не меў шырокай падтрымкі.

У Расійскай імперыі з канца XIX ст. на Заходніх акраінных тэрыторыях асаблівую актыўнасць праяўлялі арганізацыі сацыялістычнага кірунку. Беларусь у гэтых адносінах не стала выключэннем. Аднак для распаўсюджвання нацыянальных ідэй на беларускіх землях існавала ў той час шмат перашкод, якія былі звязаны, з аднога боку, з імперскай палітыкай расійскага ўрада, з другога – з характарам сацыяльнага асяроддзя, якое стала тут вынікам асаблівага гістарычнага лёсу беларускага краю.

Што тычыцца ўрадавай палітыкі па нацыя-нальным пытанні ў Беларусі, якая афіцыйна лічылася ў Расійскай імперыі яе Паўночна-Заход-нім краем, то яна на працягу XIX–пачатку XX ст. набыла яскрава выразны русіфікатарскі характар. Гэта азначае, што для ўлады вырашэнне нацыянальнага пытання ў гэтым краі зводзілася да своечасовага падаўлення ўсяго, што магло быць звязана як з фарміраваннем нацыяналь-най ідэі, так і з развіццём нацыянальнага руху. Вядома ж, іншай палітыкі ў самадзяржаўнай улады не магло і быць. У савецкай гістарыяграфіі яна асвятляецца даволі шырока, таму ў даным выпадку ніякай патрэбы займацца гэтым пытаннем няма.

Аднак вывучэнню сацыяльнага асяроддзя та-гачаснай Беларусі і таго, як яно адбілася на фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і ўвогуле нацыянальнага руху, гісторыкі неабходнай увагі не надавалі. Хоць неабходна адзначыць, што ў апошнія гады выйшла некалькі навуковых прац, у якіх гэта пытанне з рознай ступенню глыбіні асвятляецца такімі гісторыкамі, як Л.Е. Гарызонтаў [2], В.Е. Казлякоў [3], А. Смалянчук [4], М.С. Сташкевіч [5], П.І. Брыга-дзін [6] і інш.

Беларусь у гэты перыяд заставалася рэгіё-нам Расійскай імперыі, дзе сацыяльная структура насельніцтва ўяўляла такі склад, пры якім карэнная яго частка – беларусы – практычна не мела нацыянальнай свядомасці. Нягледзячы на даволі працяглы перыяд капіталістычнага развіцця краіны ў другой палове XIX ст., беларусы не стварылі сваёй нацыянальнай эліты ў асобе буржуазнага класа і нацыянальна свядомай інтэлігенцыі. І сярод рабочых у беларускім краі 60% складалі яўрэі, 17% – беларусы, па 10% – палякі і рускія, каля 4% – латышы, літоўцы і украінцы [7, с. 29]. Што ж тычыцца гараджан, то, згодна з перапісам 1897 г., большую частку насельніцтва таксама складалі яўрэі – 53,3%, ка-ля 18% – рускія, 17% – беларусы, 6% – палякі і іншыя каля 5% [8, с. 169].

Таму, калі супярэчнасці ў краіне на рубяжы XIX–XX ст. абвастрыліся, а разам з імі яшчэ большую вастрыню набыло нацыянальнае пытанне, на тэрыторыі Беларусі першай нацыянальнай партыяй сацыял-дэмакратычнага тыпу, якая ўзнікла ў 1892 г., была не беларуская, а Польская сацыялістычная партыя (ППС) – першая і па Расіі.

Распрацаваныя ППС тэзісы праграмы не вызначалі дакладнага шляху да сацыялізму, але ў іх прынцыпова падкрэслівалася, што пераход да новага грамадства магчымы толькі ва ўмовах незалежнай Польскай дзяржавы. З’езд пацвердзіў устаноўку на «сепаратызм» у адносінах да расійскага рэвалюцыйнага руху, не адмаўляючыся пры гэтым ад магчымасці сумеснай з расіянамі барацьбы супраць царызму [9, с. 465–467].

Аднак сярод сацыялістаў існавалі значныя разыходжанні па пытанні пра незалежнасць Польшчы, што паспрыяла расколу. Ужо ў 1893 г. ад ППС аддзялілася невялікая частка партыі, якая атрымала назву Сацыял-Дэмакратыя Каралеўства Польскага (СДКП). У адрозненне ад ППС яна ставіла ў аснову барацьбы не дасяг-ненне палітычнай незалежнасці Польшчы, а заваяванне палітычнай улады пралетарыятам. У сакавіку 1894 г. адбыўся першы з’езд СДКП. Рэзалюцыі гэтага з’езда ўвайшлі ў аснову пра-грамы партыі. Праграма-мінімум прапаноўвала звяржэнне царызму і стварэнне ў Расіі дэмакратычнай рэспублікі, складальнай часткай якой па-вінна была стаць Польшча. У 1900 г. на другім з’ездзе партыі (пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Варшавай) па ініцыятыве Ф. Дзяржынскага адбылося аб’яднанне СДКП і Рабочага Саюза Літвы. Новая партыя атрымала назву Сацыял-Дэмакратыя Каралеўства Польс-кага і Літвы (СДКПіЛ) [9, с. 568–571].

У абвешчанай у 1905 г. праграме СДКПіЛ гаварылася, што партыя імкнецца сумесна з сацыял-дэмакратыяй усіх капіталістычных краін да ажыццяўлення сацыялістычнага ладу. Вырашэнне нацыянальнага пытання партыя разумела праз абвяшчэнне дэмакратычнай рэспублікі ва ўсёй Расійскай дзяржаве, раўнапраўе ўсіх нацыя-нальнасцей, якія ў ёй пражываюць, з гарантаваннем ім свабоды карыстання роднай мовай і дзяржаўную аўтаномію для Польшчы. У 1906 г. адбы-лося аб’яднанне СДКПіЛ з Расійскай Сацыял-Дэмакратычнай Рабочай Партыяй (РСДРП). Згодна з дасягнутым пагадненнем, СДКПіЛ увай-шла ў агульнарасійскую сацыял-дэмакратыч-ную партыю ў якасці адзінай тэрытарыяльнай арганізацыі [10, с. 15].

Такім чынам, узнікненне і дзейнасць першай на тэрыторыі Беларусі партыі сацыялістычнага кірунку да беларускага нацыянальнага пытання ніякага дачынення не мела. Самі ж беларусы заставаліся пакуль што не гатовымі да такіх дзеянняў.

Не паўплывала на беларускае нацыянальнае пытанне і РСДРП, арганізацыі якой пачалі ўзнікаць у Расіі ў другой палове 90-х гг. XIX ст. РСДРП была абвешчана 1–3 сакавіка 1898 г. у Мінску, дзе па ініцыятыве шэрага сацыял-дэмакратычных арганізацый адбыўся I з’езд расійскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый. На тэрыторыі краю ў пачатку 1906 г. сацыял-дэмакратычныя арганізацыі дзейнічалі ў Вільні, Смаргоні, Віцебску, Дзвінску, Полацку, Мінску, Бабруйску, Магілёве [11, с. 28–29, 35].

Пры аб’яднанні расійскіх сацыял-дэмакратычных арганізацый у адзіную партыю нараўне з задачай склікання новага з’езда ўзрастала неабходнасць распрацоўкі партыйнай праграмы. Вырашэнне нацыянальнага пытання прадугледжвалася пунктам 9 праграмы РСДРП – зняржэнне царскага самаўладдзя і ўстанаўленне ў краіне дэмакратычнай рэспублікі, права на самавызначэнне павінна было быць прадастаўлена ўсім нацыям, што ўваходзяць у склад дзяржавы [12, с. 30–31].

Аднак дадзенае праграмнае палажэнне РСДРП у У.І. Леніна атрымала своеасаблівую інтэрпрэтацыю, паколькі нацыянальнае пытанне разглядалася ім праз прызму класавага падыхо-ду. Свае погляды па нацыянальным пытанні ім дастаткова пэўна выказаны ўжо ў 1903 г. у працы «Нацыянальнае пытанне ў нашай праграме», апублікаванай у газеце «Искра». Ён пісаў: «Сацыял-дэмакратыя, як партыя пралетарыяту, ставіць сваёй станоўчай і галоўнай задачай садзейнічанне самавызначэнню не народаў і нацый, а пралетарыяту ў кожнай нацыянальнасці...» [13, с. 233]. Пазней ён удакладніць, што «аўтаномія – наш план усталявання дэмакратычнай дзяржавы. Аддзяленне ўвогуле не наш план. Аддзяленне мы не прапаведуем…, мы супраць аддзялення» [14, с. 235].

У перыяд станаўлення расійскай сацыял-дэмакратыі доўгі час сярод іншых арганізацыйных момантаў дамінавала тэма яўрэйскага пралетарыяту. Так, 25–27 верасня 1897 г. у Вільні адбыўся I з’езд прадстаўнікоў груп яўрэйскіх сацыял-дэмакратаў, дзе быў выбраны ЦК, вызначаны цэнтральныя друкаваныя органы – «Арбэйтэр шцімэ» («Рабочы голас») і тэарэтычны часопіс «Ідзішэр арбэйтэр» («Яўрэйскі рабочы»), а таксама назва арганізацыі «Усеагульны яўрэйскі саюз у Польшчы і Расіі» – Бунд, лідэрам якога стаў А. Крэмер. Бунд складаўся пераважна з



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадстаўнікоў інтэлігенцыі, рабочых, студэнцтва і зарэкамендаваў сябе актыўным арганізатарам эканамічнай барацьбы ў Паўночна-Заходнім краі і Польшчы. Неабходнасць утварэння Бунда матывавалася тым, што толькі нацыянальная арганізацыя яўрэйскіх рабочых можа найлепш абараніць іх інтарэсы [15, с. 369]. Як адзначыў віленскі генерал-губернатар П.Д. Святаполк-Мірскі, «яўрэйская палітычная арганізацыя «Бунд» дзейнічае з велізарнай энергіяй, хутка ўзмацняе свае рады» [16, с. 115].

У 1898 г. Бунд прыняў удзел у падрыхтоўцы і правядзенні I з’езда РСДРП і ўступіў у агульнарасійскую партыю як арганізацыя, аўтаном-ная ў пытаннях, што датычыліся спецыяльна яўрэйскага пралетарыяту. На мяжы XIX–XX ст. Бунд заняў вядучыя пазіцыі ў сацыял-дэмакратычным і рабочым руху ў заходніх губернях. Адначасова з кіраўніцтвам эканамічнай барацьбой яўрэйскіх рабочых лідэры Бунда пачалі пераглядаць нацыянальныя патрабаванні. На III з’ездзе Бунда (Коўна, 1899 г.) на парадку дня было пытанне пра нацыянальнае раўнапраўе.

Нацыянальная праграма Бунда неаднаразо-ва абмяркоўвалася і ўдакладнялася на яго з’ездах і канферэнцыях. Рэзалюцыя па нацыянальным пытанні была прынята ў лютым 1905 г. і змяшчала наступныя палажэнні: поўнае грамадзянскае і палітычнае раўнапраўе яўрэяў; забяспечаная законам магчымасць для яўрэйскага насельніцтва ўжывання роднай мовы ў зносінах з судом, дзяржаўнымі ўстановамі і органамі мясцовага і абласнога самакіравання; нацыянальна-культурная аўтаномія і інш. [10, с. 33].

Бунд быў лютым праціўнікам сіяніцкіх па-мкненняў як Яўрэйскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі «Паалей-Цыён» (ЯСДРП ПЦ), так і Сіяніцка-сацыялістычнай рабочай партыі (ССРП) і Сацыялістычнай яўрэйскай рабочай партыі (СЯРП), якія таксама актыўна дзейнічалі на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю [17, с. 139].

Узнікненне і дзейнасць яўрэйскіх нацыяналь-ных партый сацыял-дэмакратычнага напрамку – ЯСДРП ПЦ, ССРП і СЯРП – стала вынікам радыкалізацыі сіяніцкага[1] руху ў 1904–1907 гг. [18, с. 132].

Тлумачэнне радыкалізацыі сіяніцкага руху знаходзім таксама ў «Всеподданнейшем отчете…» П.Д. Святаполк-Мірскага, які тлумачыў гэ-та захопленасцю ўрада барацьбой з польскімі палітычнымі рухамі і, як вынік, выпушчэннем з-пад увагі самабытнага росту яўрэяў і іх самаразвіцця [16, с. 114].

Па сваім класавым саставе ў перыяд рэвалюцыі 1905–1907 гг. арганізацыі паалейцыяніс-таў у Расіі (у асноўным у Паўночна-Заходніх, Паўднёва-Заходніх і Паўднёвых губернях) былі галоўным чынам з паўпралетарскіх і дробнарамесных элементаў. Асноўным пунктам праграмы-мінімум, які адрозніваў яе ад праграм іншых сацыял-дэмакратычных партый, з’яўлялася патрабаванне тэрытарыяльнай аўтаноміі на дэмакратычных пачатках для яўрэйскага народа ў Палесціне [10, с. 89].

Адной з найбольш значных па сваім уплыве сярод яўрэйскіх палітычных партый была Сіяніцка-сацыялістычная рабочая партыя. Першыя спробы стварыць яе былі ў пачатку 1904 г. у Вільні (выбраны часовы ЦК). ССРП была аднадушная з

[1] **Сіянізм** (ад назвы гары Сіён у Іерусаліме) – яўрэйскі нацыянальны рух, мэтай якога з’яўляецца аб’яднанне яўрэйскага народа на яго гістарычнай радзіме – у Палесціне (Эрэц-Ізраэль).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

усімі яўрэйскімі сацыялістычнымі партыямі ў тым, што вырашэнне яўрэйскага пытання магчымае не ў выніку сацыялістычнай рэвалюцыі ў краінах «дыяспары», а толькі шляхам стварэння аўтаномнай яўрэйскай нацыяналь-най гаспадаркі. Для стварэння ж неабходных умоў для свабоднага сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-палітычнага жыцця яўрэйскія масы павінны былі набыць свабодную тэрыто-рыю, дзе яны маглі б сканцэнтравацца і жыць як народ на нацыянальна-аўтаномных пачатках [10, с. 180].

Але ССРП прызнавала, што «рэальныя інтарэсы яўрэйскай масы ляжаць не ў Палесціне і не ў імкненні да гэтай краіны...», а на практы-цы гэта азначала, што ССРП стаяла на пазіцыях вырашэння яўрэйскага пытання на месцах, г. зн. у краінах яўрэйскай дыяспары, без масавага перасялення яўрэяў у Палесціну [10, с. 182].

Самай уплывовай сацыялістычнай партыяй на тэрыторыі беларускіх губерняў была партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў (ПСР, эсэраў). Першыя групы эсэраў узніклі ў 1894–1895 гг. У канцы 1901 г. найбольш значныя арганіза-цыі аб’ядноўваюцца ў партыю, што канчаткова канстытуіравалася на I з’ездзе (19.12.1905–04.01.1906). З мэтай каардынацыі дзейнасці мясцовых арганізацый вясной 1904 г. было прапанавана ўстанавіць межы 9 тэрытарыяльных саюзаў. У Паўночна-Заходнюю абласную арганізацыю былі аднесены эсэраўскія арганізацыі ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Вільні, Беластоку, Смаленску, Магілёве [2, с. 60].

На I з’ездзе партыі былі прынятыя праграма і статут. Прынятая на II з’ездзе ПСР (снежань 1905 – студзень 1906 гг.) праграма па нацыянальным пытанні была самай радыкальнай і дэмакратычнай з усіх нацыянальных праграм партый, якія існавалі ў той час. Яна была накіравана на ліквідацыю нацыянальнага прыгнёту, а таксама на ўстанаўленне роўнасці ўсіх нацый і народнасцей і даверу паміж нацыянальнасцямі, дэкларавалася прызнанне безумоўнага права нацый на самавызначэнне [10, с. 144].

Блізкай да эсэраў па сваіх праграмных палажэннях была Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) – нацыянальная партыя леванародніцкага кірунку, якая была ўтворана ў пачатку 1902 г. у Мінску. Стваральнікамі БСГ былі браты А.І. Луцкевіч (А. Новіна) і І.І. Луцкевіч, В.Ю. Ластоўскі, К. Кастравіцкі (К. Каганец), А. Бурбіс, В. Іваноўскі, Ф. Умястоўскі, А. Пашкевіч (Цётка) і інш.

На I з’едзе ў 1903 г. БСГ прыняла праграму, дзе канчатковай мэтай абвясціла знішчэнне капіталістычнага ладу. У пракламацыях 1905 г. па праблемах нацыянальнага пытання БСГ выступала за ўсталяванне ў Расіі федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі з агульным сеймам (Канстытуцыйным сходам) для ўсіх народаў і за наданне кожнаму народу права мець свой сейм, які «вёў бы яго справы». У студзені 1906 г. у Мінску адбыўся II з’езд БСГ, на якім была прынята новая праграма, статут, выбраны ЦК з пяці чалавек. Для Беларусі грамада патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі з мясцовым сеймам у Вільні [9, с. 62].

Праявы беларускага нацыянальнага руху ў левaрадыкальным палітычным спектры былі дастаткова шматлікімі. Яны былі толькі невялікімі іскрынкамі народнага прабуджэння, часцей студэнцтва і нешматлікай нацыянальнай інтэлігенцыі, і па ахопе надзвычай малымі. Пераважная большасць беларускага сялянства была не гатовая да ўспрымання хоць якой-небудзь нацыянальнай ідэі. Негатыўна паўплывала на нацыянальны працэс таксама адсутнасць у беларускім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

грамадстве праслойкі, зацікаўленай у паўстанні нацыі і адначасова здольнай падтрымаць працэс яе развіцця [19, с. 216].

Тым не менш, гэты рух прыйшоў да стварэння першай нацыянальнай палітычнай беларускай партыі, якая паставіла вырашэнне беларускага нацыянальнага пытання на праграмнай аснове.

Нацыянальная палітыка расійскага самаўладдзя ў краіне ўвогуле і ў Паўночна-Заходнім краі ў прыватнасці, што прывяла да рэвалюцыі 1905 – 1907 гг., не толькі не вырашала ключавых пытанняў, але і садзейнічала іх абвастрэнню.

Сацыялістычныя партыі, якія ўзніклі і дзейнічалі на мяжы XIX – XX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў, за выключэннем ПСР, аказаліся не ў стане распрацаваць праграмныя палажэнні па нацыянальным пытанні, якія б у поўнай ступені адпавядалі інтарэсам як асобных нацый і народнасцей, так і ўсяго грамадства. Лідэры сацыял-дэмакратаў ігнаравалі ідэю добраахвотнага пагаднення нацый у барацьбе за ліквідацыю імперыі і дасягнення яе народамі палітычнай незалежнасці.

Такім чынам, нацыянальнае пытанне ў праграмах партый сацыялістычнага напрамку ў Беларусі, як і ва ўсёй краіне, звязвалася з далёкай перспектывай сацыялістычнага ўладкавання грамадства. Сама ж яго пастаноўка ў значнай ступені садзейнічала актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця. Асаблівасцю ідэі сацыялізму ў Беларусі, як і наогул у заходніх раёнах Расіі, было тое, што яна мела пераважна еўрапейскі характар і служыла зброяй у барацьбе супраць паўазіяцкага самадзяржаўя, тады як у Велікарасіі яна насіла народніцкі характар.

*ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ*

1. *Мирослав Хрох.* От национальных движений к полностью сформировавшейся нации: процесс строительства наций в Европе // Нации и национализм / Б. Андерсон, О. Бауэр, М. Хрох и др. – М.: Праксис, 2002. – 416 с.
2. *Бригадин, П.И.* Эсеры в Беларуси (конец XIX в. – февраль 1917 г.) / П.И. Бригадин. – Минск: Згода, 1994. – 152 с.
3. *Горизонтов, Л.Е.* Парадоксы имперской политики: поляки в России и русские в Польше (XIX – начало XX в.) / Л.Е. Горизонтов – М.: Индрик, 1999. – 272 с.
4. *Козляков, В.Е.* Национальный вопрос и неонароднические партии. Начало XX в. – конец 20-х гг. (На материалах Рос-сии, Беларуси, Украины) / В.Е. Козляков – Минск: БГТУ, 1991. – 247 с.
5. *Сташкевич, Н.С.* Формирование идеи белорусской государ-ственности в конце XIX века. / С.Н. Сташкевич // Беларус. гіст. часопіс. – 2007.
6. *Смалянчук, А.* Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польс-кі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864–люты 1917 г. / А. Смалянчук – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
7. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пуузыны – Усая / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2001. – 592 с.
8. *Шыбека, З.В.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагаддзя) / З.В. Шыбека. – Мінск: ЭўроФорум, 1997. – 292 с.
9. Программы политических партий России. Конец XIX – XX вв. – М.: РОССПЭН, 1995. – 464 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

10. Политические партии России. Конец XIX – первая треть XX ве-ка: энциклопедия. – М.: РОССПЭН, 1996. – 872 с.
11. Политические партии России в период революции 1905–1907 гг.: Количественный анализ: сб. ст. / АН СССР. Ин-т истории СССР. – М., 1987. – 243 с.
12. Меньшевики. Документы и материалы. 1903 – февраль 1917 гг. – М.: РОССПЭН, 1996. – 408 с.
13. *Ленин, В.И.* Национальный вопрос в нашей программе / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. Т. 7. – 623 с.
14. *Ленин, В.И.* С. Г. Шаумяну. 6 декабря 1913 г / В.И. Ленин // Полн. собр. соч. Т. 48. – 544 с.
15. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. Ч. 1. М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш. – Мінск: Беларусь, 1994. – 527 с.
16. «Всеподданнейший отчет...» виленского, гродненского и ко-венского генерал-губернатора П.Д. Святополк-Мирского Николаю II от 20 мая 1904 г. (падрыхтавалі да друку Міхась Біч і Віктар Пінчукоў) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 94–116.
17. История национальных политических партий России: материалы Междунар. конф. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 1997. – 408 с.
18. *Томашевич, В.М.* Радикализация сионистского движения в Российской Империи (1904–1907) / В.М. Томашевич // Веснік Віц. ДУ, 2003. № 2 (28). – С.132–135.
19. *Радзік, Р.* Прычыны слабасьці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX–XX ст. / Р. Радзік // Беларускі гістарычны агляд. – 1995. – Т. 2. – С. 195–225.

*SUMMARY*

*In clause becoming and development of an ethnic question, definition of ways of its decision in programs and activity of the socialist parties acted on territories of Northwest edge is investigated. Influence of activity of revolutionaries on socially is studied? A political life in provinces of edge in the end XIX? Beginning XX of century.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ